**Тэкст дыктанта**
**для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**
**ў ДУА "Мінскае абласное кадэцкае вучылішча"**

**9 клас**

## Сведкі мінуўшчыны

Праз шырокія дарогі і гаманлівыя рачулкі, ускрай палеткаў і ў лясных гушчарах, уткнуўшыся ў зямлю, ляжаць замшэлыя старажытныя валуны. Гэтаксама маўкліва ляжалі яны і дваццаць тысяч гадоў назад. Гэтыя камяні памятаюць войны часоў Кіеўскай Русі, набегі крыжакоў, нашэсці шведскіх, напалеонаўскіх і гітлераўскіх полчышчаў. Валуны складаюць неадлучную частку ландшафту. Без іх беларуская прырода значна збяднее.

З кожным годам такіх камянёў становіцца ўсё менш. Яны выкарыстоўваюцца дарожнікамі і будаўнікамі, ад іх стараюцца пазбавіцца земляробы. Вучоныя называюць гэтыя стварэнні прыроды камянямі-падарожнікамі. Яны шмат могуць расказаць пра геалагічнае мінулае і багацце роднага краю. З'яўляючыся адметнай рысай наваколля, валуны ўжо сёння самыя шматлікія сярод геалагічных помнікаў прыроды нашага краю. Як крупінка духоўнага і матэрыяльнага жыцця людзей многія камяні трапілі ў спіс помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. (123 словы)

*Паводле Э. Ляўкова.*